# ЗМЯСТОЎНЫЯ КАНСТАНТЫ ВЫХАВАННЯ АСОБЫ ПАТРЫЁТА І ГРАМАДЗЯНІНА: ГІСТАРЫЧНЫ КАНТЭКСТ

М.М. Шчэрбін
УА "Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна"

Эвалюцыя зместу грамадзянска-патрыятычнага выхавання, абумоўленая развіццём уяўленняў аб асобе патрыёта і грамадзяніна на беларускіх землях, праяўлялася ў фарміраванні запатрабаваных грамадзянска-патрыятычных рыс і якасцей на падставе гістарычнай пераемнасці і



МГПУ им. И.П.Шамякина

кан’юнктурызацыі аб’ектыўных рэалій быцця. Дэтэрмінацыя развіцця грамадзянска-патрыятычных рыс і якасцей адбывалася як знешнімі сацыякультурнымі абставінамі, так і ўнутранай дынамікай выхаваўчага працэсу. Побач з гэтым зместу выхавання патрыёта і грамадзяніна ўласцівы светапоглядна-каштоўнасныя кантстанты, якія вызначалі вектар яго руху ў межах пэўнага гісторыка-культурнага асяроддзя.

Найпершае месца сярод змястоўных канстант выхавання асобы патрыёта і грамадзяніна на беларускіх землях належыць духоўнаму самаразвіццю і ўдасканаленню асобы. Дадзеная састаўляючая знайшла праяўленне ў актыўнай дабрачыннасці і ўзаемадапамозе ў адносінах да іншых. Альтруістычны характар такой дабрачыннасці быў абумоўлены шмат у чым культурна-побытавым адзінствам, скіроўваў да прыхільных узаемаадносін у межах калектыву, грамады, супольнасці. “Паважлівы і добры будзь да ўсякага чалавека, і за вочы і ў вочы” – гэта спосаб “дасягнуць многага ў вачах Бога і людзей”, – сцвярджалі старажытныя крыніцы, настаўляючы маладое пакаленне [5, 497].

Суаднясенне сваіх учынкаў з зацверджанымі нормамі супольнай жыццядзейнасці мела значнае выхаваўчае ўздзеянне на асобу, было сугучна ідэям актыўнай дабрачыннасці. “Не месца робіць дабрадзейным, але дабрачыннасці месца ўпрыгожваюць”, – былі ўпэўнены нашы продкі [6, 487]. Разуменне добрачыннасці абапіралася на ідэю “агульнага дабра”, якая трымала ўсю светапоглядную сістэму сярэдневяковага чалавека, заснаваную на хрысціянскім чалавекалюбстве. “Успомні голад падчас сытасці, беднасць і ўбогасць падчас багацця, ад раніцы і да вечара пераменіцца час”, – падкрэслівалі фларэлегіі, высока ацэньваючы ўменне спачуваць і дапамагаць іншым як адну з важных асобасных якасцей [6, 501].

Неабходнасць быць карысным іншым людзям як значную асобасную якасць чалавека-патрыёта і чалавека-грамадзяніна вылучалі старажытныя крыніцы, якія падкрэслівалі, што “чалавек добры той, хто карысць прыносіць” [6, 489]. Па гэтай прычыне агульную вядомасць і ўсхваленне на беларускіх землях набылі тыя, хто “ўпрыгожылі” сябе добрымі справамі, з’явіліся ўзорамі духоўнага ўдасканалення [6, 487].

Рэлігійна-асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага з’яўвілася прыкладам рэалізацыі добрых спраў дзеля агульнай карысці, што насіла ярка выражаны патрыятычны характар і на стагоддзі стала ўвасабленнем спалучэння глыбокай веры і адданага служэння людзям. Аснову светапоглядных меркаванняў Тураўскага епіскапа складала хрысціянская філасофія. Сярод шэрагу дабрачыннасцей, якія вызначаюць сапраўднага чалавека, ён вылучаў найперш “маральную чысціню, міласэрнасць, любоў да ўсіх” [3, 158]. Кірыла Тураўскі лічыў, што толькі шчырая вера і добрыя справы дазволяць стаць на “шлях да Бога”, выратуюць чалавека ад забыцця [3, 159]. У сімвалічна-алегарычнай форме асветнік вызначае кола добрадзейных і заганных чалавечых якасцей. Пакора прадстаўлена асветнікам

МГПУ им. И.П.Шамякина

“у вобразе лагоднай маці, а ўсе астанія чалавечыя дабрачыннасці – яе дзеці, бацька якіх сам Бог” [3, 181]. Вось чаму і чыстая вера, і пакаянне, і цярплівасць, і стараннасць, і дабрачыннасць, як лагодная маці, клапоцяцца аб выратаванні чалавека, аб яго вечным жыцці. А “ганарыстасць – маці заганаў чалавечых”, выступае ў вобразе мачыхі, дзеці якой – “пыху, непакорлівасць, паклёп, гнеў, варожасць, усялякае зло”, штурхаюць чалавека ў “цемру і нязгасны агонь” [3, 182]. Вядомы хрысціянскі пастулат “не для таго прыйшоў, каб мне паслужылі, а каб самому паслужыць” асветнік тлумачыў літаральна – праз дабрадзейныя справы кожнага і любоў да ўсіх назалежна ад становішча і пасады [3, 182].

Ідэі Кірылы Тураўскага падзяляла не менш вядомая беларуская асветніца Ефрасіння Полацкая. Актыўная культурна-асветніцкая дзейнасць падзвіжніцы была накіравана на агульнае дабро: распаўсюджванне “вучэння кніжнага”, перапісванне кніг, будаўніцтва храмаў і манастыроў – усё для магчымасці не толькі набліжэння да Бога, але і для плёну свайго народу. Яна паказала “прыклад руплівага служэння на карысць грамадства і Айчыны” [3, 297]. Вучыла Ефрасіння Полацкая “душэўнай чысціні, голасу пакорліваму, слову благачыннаму”, а галоўнае, “любові без крывадушнасці да роўных, і да меншых” таму, што “ўсіх хацела бачыць аднадушнымі”, – адзначае “Жыціе” святой [3, 299]. Асаблівая пашана, з якой сустракалі беларускую манахіню падчас яе падарожжа ў Іерусалім “вся грады і власці”, выказваючы “гонар вялікі”, яскравае падцвярджэнне прызнання найвялікшай ролі самаадданай працы асветніцы для дабра іншых людзей [3, 323]. Ефрасіння Полацкая стала “сімвалам духоўнага служэння сваёй Радзіме, невычэрпнай крыніцай маральнай сілы і духоўнага адраджэння народа” [3, 298].

Другой змястоўнай канстантай выхавання асобы патрыёта і грамадзяніна на беларускіх землях выступала традыцыйнасць і захаванне сваіх звычаяў. Арыентаванасць на цесную ўзаемасувязь з мінулым, як форма спадчыннасці, з’яўлялася асновай пастулальнага развіцця народу, яго стабільнасці, валодала значнымі педагагічнымі магчымасцямі. Па гэтай прычыне захаванне сваіх традыцый пазіцыянавалася важным жыццёвым рэсурсам таму, што “ўсё новае добра, але старое – усяго лепей і крапчэй”, – падкрэслівалі нашы продкі [5, 449]. Адданасць сваім звычаям абумовіла грамадскую каштоўнасць традыцыяналізму на беларускіх землях, што падтрымліваў звычайнасць быцця. Нямецкі філосаф В. Вундт лічыў, што звычай мае найгалоўнейшае значэнне ў адлюстраванні “духу народу” побач з міфам і мовай [7, 30]. Ён, на думку даследчыка, прадстаўляе сабой “агульны накірунак волі народу”, які адлюстроўвае архетыпы яго дзеянняў і паводзін у адносінах усяго навокал [7, 30]. Народная мудрасць таксама адзначала неабходнасць прытрымлівання сваіх звычаяў у якасці важнай крыніцы захавання сваёй самабытнасці – “воўк кожны год ліняе, а звычая не мяняе” [4, 34].

МГПУ им. И.П.Шамякина

У сувязі з гэтым адданасць традыцыйным формам жыццядзейнасці валодала значным патэнцыялам у фарміраванні прыхільнасці канкрэтнай зямлі, народу, краіне. Моцныя сацыякультурныя асновы такой прыхільнасці абумовілі неабходнасць падтрымання адпаведнай сістэмы звычаяў і традыцый як праяўленне імкнення да дабрабыту свайго народу і краіны. Па меркаванні Ю.В. Чарняўскай, менавіта традыцыйныя каштоўнасці "складаюць нацыянальны вобраз, у спрошчаным выразе – мадэль свету", якая вызначае жыццёвыя прыярытэты этнасу, аказвае ўплыў на эвалюцыю яго выхаваўчых арыенціраў [7, 28].

Складальнікі фларэлегій, акцэнтуючы ўвагу на важным значэнні пераемнаснай сувязі пакаленняў праз захаванне сваіх звычаяў і традыцый, адзначалі, што "сад, які часта перасаджваюць плада не прыносіць" [5, 507]. Фальклорныя крыніцы падтрымлівалі гэтую думку і слушна падкрэслівалі – "без глыбокага кораня дуба не бывае" [4, 85]. Важнае выхаваўчае значэнне мела паступовае далучэнне індывіда да фальклорнай і песеннай традыцыі, удзел з дзяцінства ў каляндарнай і сямейнай абраднасці – усё гэта спрыяла фарміраванню цікавасці да свайго мінулага, разумення неабходнасці яго захавання і абароны для наступных пакаленняў, насіла ярка выражаны грамадзянска-патрыятычны характар. Акрамя таго, абумовіла пэўны вектар этнакультурнага развіцця народу ў межах усходнеславянскай культурнай прасторы, што мела важнае значэнне для фарміравання зместу выхавання грамадзяніна і патрыёта.

Ва ўмовах этнічнай самаідэнтыфікацыі каштоўнасныя адносіны да сваіх звычаяў і традыцый рабілі больш мэтанакіраваным працэс фарміравання беларускай народнасці, садзейнічалі замацаванню этнакультурных асаблівасцей, ментальных пераваг.

Важнай змястоўнай канстантай выхавання асобы патрыёта і грамадзяніна з'яўляецца <u>пераемнасць і адзінства</u>, што выступала адлюстраваннем прыхільнасці да кансалідацыйнага пачатку жыццядзейнасці. Дадзеная прыхільнасць была шмат у чым абумоўлена гістарычнымі асаблівасцямі: пражываннем беларусаў у складзе моцнай сялянскай абшчыны, існаваннем шматлікіх сумесных работ, агульным характарам вядзення гаспадаркі, прынцыпам вясковай узаемадапамогі ў любых жыццёвых сітуацыях. "Кожная птушка ляціць у сваю чародку", – пацвярджала народная прыказка перавагу супольных форм быцця беларусаў [4, 278]. Такая кансалідацыйная грамадская ўзаемасувязь выступала формай адданасці традыцыйным асновам жыццядзейнасці нашых продкаў, дэманстравала імкненне да згуртаванасці.

Прыярытэт адзінства і пераемнасці як гістарычна найбольш мэтазгодная аснова дзяржаўнага будаўніцтва выступаў вядучым змястоўным канцэптам першага славянскага летапіснага зводу – "Аповесці мінулых гадоў". Паступальнае развіццё грамадства з арыентацыяй на цэласнасць разглядалася гарантам існавання народу, закладам яго росквіту: "згода будуе, а нязгода руйнуе", – былі перакананыя нашы продкі [3, 60].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Пры гэтым, калі тэрытарыяльнае адзінства разумелася крыніцай развіцця і падтрымкі дзяржаўна-палітычных працэсаў, то духоўная пераемнасць выступала важным сродкам ідэнтыфікацыі асобы з пэўным гісторыка-культурным асяроддзем, духоўнымі каштоўнасцямі.

З аднаго боку, абставіны дзяржаўнага будаўніцтва дэтэрмінавалі грамадскую запатрабаванасць палітычнага адзінства і цэласнасці ў якасці важнай умовы існавання і развіцця краіны і народу. Вядомыя словы летапісца "ў адзінстве нашым вялікая сіла" сталі своеасаблівым заклікам да аб'яднання і дзяржаўна-палітычнай кансалідацыі [3, 98]. Неабходнасць захавання і абароны сваёй краіны як тэрыторыі адзінага княства з'яўлялася ключавой ідэяй першых беларуска-літоўскіх летапісаў ("Летапіс вялікіх князёў літоўскіх", "Беларуска-літоўскі летапіс 1446 г."). Цэласнасць княства вызначалася летапісцамі крыніцай дабра для дзяржавы і народу – "як добра і прыгожа, калі жывуць браты разам", толькі "адзін аднаму пасабляючы і брат брату дапамагаючы як град цвёрды" будзе краіна, – былі перакананы складальнікі хронікі [2, 88].

З другога боку, духоўна-светапогляднае яднанне, як значную рысу грамадзянска-патрыятычнага адзінства забяспечвала рэлігія, менавіта хрысціянства як адзіная рэлігія шмат у чым садзейнічала таму, што ўяўленні аб Радзіме "перарастаюць межы сялянскай абшчыны і нават княства, пашыраючыся да зямлі-краіны" [1, 179]. З рэлігійным аднадумствам атаясамлівалася на ўсходнеславянскіх землях грамадзянска-патрыятычная ідэя аб'яднання, абароны супраць знешняй пагрозы як найпершых акалічнасцей існавання дзяржавы і народу. У якасці аднаго з самых цяжкіх выпрабаванняў для чалавека гістарычныя крыніцы, што апелявалі да хрысціянскай этыкі, адзначалі быць "прышэльцамі ў зямлі не сваёй", падкрэсліваючы вядучую ролю Радзімы як асновы асобаснага існавання і развіцця [3, 45].

Такім чынам, духоўнае развіццё і самаўдасканаленне асобы, традыцыйнасць і захаванне сваіх звычаяў, пераемнасць і адзінства як змястоўныя канстанты выхавання асобы патрыёта і грамадзяніна на беларускіх землях выступалі адлюстраваннем інтэграцыі рэлігійна-філасофскіх ідэй з народна-педагагічнымі ўяўленнямі аб фарміраванні адданага маладога пакалення, неабыякавага да лёсу сваёй Радзімы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Забияко, А.П. История древнерусской культуры / А.П. Забияко. – М.: Интерпракс, 1995. – 304 с.

2. История общественной и философской мысли в Беларуси: раннее и развитое Возрождение: хрестоматия: пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев: УО «МГУ им. А.А. Кулешова», 2010. – 332 с.:ил.

3. История общественной и философской мысли в Беларуси: эпоха Средневековья: хрестоматия: пособие / авт.-сост. В.В. Старостенко. – Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2009. – 396 с.

4. Лепешаў, І.Я. Тлумачальны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў, М.А. Якалцэвіч. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 695 с.



МГПУ им. И.П.Шамякина

5. Наставление отца сыну // Памятники литературы Древней Руси. XIV – середина XV века / Вступ. статья Д.С. Лихачева; сост. и ред. Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачева. – М.: Худ. лит., 1981. – С. 496–500.
6. Пчела // Памятники литературы Древней Руси: XIII век / Вступит. статья Д.С. Лихачева; общ. ред. Л.А. Дмитриева и Д.С. Лихачева. – М.: Худ. лит., 1981. – С. 474–486.
7. Чернявская, Ю.В. Народная культура и национальные традиции: пособие для учителей. – Минск: Беларусь, 2000. – 199 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина